

Дзіцячыя пляцоўкі — за кошт жыльцоў?



Ад гарбаты з мятай да пушчанскага першака

СТАР. 6



Як пілігрымы да Будслава дайшлі

СТАР. 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛІПЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 133 (28243)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## МЫ Ў ВАС ВЕРЫМ!

**Учора адбылася ўрачыстая цырымонія праводаў нашай спартыўнай дэлегацыі на XXXI летнія Алімпійскія гульні.**



Фота БЕЛТА.

Яе неад'емнай часткай сталі выбары капітана і сцяганосца зборнай на маючай адбыцца Алімпіядзе. На знакаміты стадыён «Маракана» ў Рыа-дэ-Жанэйра нашу каманду выведзе алімпійскі чэмпіён, шматразовы пераможца чэмпіянатаў свету стралок Сяргей Мартынаў, паведамляе БЕЛТА. Капітанам беларускай зборнай будзе алімпійскі чэмпіён у веславанні на байдарках і каноэ Аляксандр Багдановіч.

Кіраўнік дзяржавы, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка ўручыў Дзяржаўны сцяг капітану беларускай спартыўнай дэлегацыі. «Памятайце, што вашы высокія вынікі — гэта пазітыўны імідж Беларусі і паказчык яе паспяховага развіцця, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Для беларускіх атлетаў гэтыя Гульні стануць самым важным экзаменам чатырохгоддзя. Наша дзяржава зрабіла ўсё неабходнае, каб вы мелі магчымасць спакойна падрыхтавацца і добра выступіць на гэтых спаборніцтвах», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цана алімпійскага медаля заўсёды была высокая, і сёння тым больш. «Паглядзіце, як абвастрылася канкурэнтная барацьба. Часта выкарыстоўваюцца неспартыўныя метады ціску на асобных атлетаў і цэлыя краіны. Ужо не выклікаюць здзіўлення скандалы, гучныя выкрыцці, перагляд вынікаў, якія даўно пайшлі ў гісторыю спаборніцтваў, — заўважыў Прэзідэнт. — Вы ўсё гэта бачыце самі, разумееце, упэўнены, перажываеце. У Рыа ўмовы для спаборніцтваў будуць няпростымі, можа быць, цяжкімі. Упэўнены, вы справіцеся з гэтым каласальным напружаннем і пакажаце добры вынік».

Гэтым разам спартсменам не ставілі медальных планаў. Але ж краіна мае права чакаць ад кожнага поўнай канцэнтрацыі і самааддачы на мяжы чалавечых магчымасцяў, адзначыў Прэзідэнт. Асобна кіраўнік дзяржавы падзякаваў беларускім баскетбалісткам, намаганнямі якіх на Алімпійскіх гульнях 2016 года Беларусь зноў будзе прадстаўлена ў гульнявых камандных відах спорту.

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада, старшыня камітэта па падрыхтоўцы да Алімпійскіх гульняў у Рыа Наталля Качанава падкрэсліла: «Для многіх атлетаў уключэнне ў склад каманды, якая накіруецца ў Бразілію, — вялікая перамога. Беларускі народ у ходзе Гульняў будзе пільна сачыць за выступленнямі і падтрымліваць беларускіх спартсменаў».

# Да родных вытокаў



Станіслаў ПУПКО вярнуўся на радзіму — на Валожыншчыну, у вёску Раднікі, амаль праз 30 гадоў, пражытых у расійскім Нечарназем'і. Цяпер Станіслаў Міхайлавіч, які добра іграе на гармоніку, — жаданы госць на фестывалях і кірмашах, што праходзяць у наваколлі. — Радзіма — сапраўдная жыватворная крыніца, якая дае фізічную і духоўную моц, — кажа зямляк. І не пагадзіцца з ім немагчыма.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Лагістыка — адзін з найбольш перспектыўных кірункаў развіцця эканомікі Беларусі. Гэтаму спрыяе размяшчэнне краіны на шляху транспартных калідораў з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень, а таксама актыўны ўдзел у інтэграцыйных працэсах, у тым ліку ў рамках ініцыятывы Вялікага Шаўковага шляху. Неабходна працягваць работу, накіраваную на павышэнне якасці і комплекснага аказання лагістычных паслуг, забеспячэнне развіцця лагістычнай інфраструктуры і павышэнне эфектыўнасці яе выкарыстання. Пры гэтым якаснаму развіццю лагістычнай сістэмы павінна спрыяць эфектыўнае выкарыстанне транзітнага патэнцыялу Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0043 | ▼ |
| Еўра | 2,2275 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0313 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0807 | ▼ |

## ПРАЦА НА РАЗВІЦЦЁ

**Прэзідэнт прызначыў кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў нашай краіны ў Кітаі і Грузіі. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы прызначаны Кірыл Руды. На пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Грузіі прызначаны Міхаіл Мятлікаў.**

«Што тычыцца Кітая, тут цяжка перааацаніць гэтую краіну. Гэта будучыня ўсёй планеты», — падкрэсліў Прэзідэнт, адзначыўшы, што паміж Беларуссю і Кітаем усталяваліся сяброўскія адносіны стратэгічнага характару. «Нам патрэбны рывок у нашых адносінах. Трэба выйсці нават не на новую прыступку, а на арбіту ў адносінах з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Вы бачыце, што яны да гэтага гатовыя, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Я бачу, што яны з адкрытым сэрцам і душой ідуць нам насустрач. У мяне вельмі блізкія сяброўскія адносіны з кіраўніцтвам КНР, і з былым, і асабліва з цяперашнім кіраўніком».

Прэзідэнт запатрабаваў, каб, адпаведна, і беларускі бок быў гатовы аператыўна рэагаваць на існуючыя магчымасці ў развіцці супрацоўніцтва. «Вы павінны дамагчыся таго, каб былі рэалізаваны самыя смелыя, рашучыя прапановы ў адносінах з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кажучы пра Грузію, Прэзідэнт адзначыў: «Грузія прытрымліваецца сваёй палітыкі, адрознай, дапусцім, ад нашай палітыкі. Але гэта права любой краіны вызначаць знешнюю і ўнутраную палітыку. Нам трэба ў гэтай сітуацыі знаходзіць пункты судакранання. Мы іх знайшлі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт паставіў задачу ў разы нарасціць тавараабарот з Грузіяй да ўзроўню ў $200 млн.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўзгадніў прызначэнне Уладзіміра Міравовіча генеральным консулам Беларусі ў Стамбуле (Турэцкая Рэспубліка) і Віктара Чараховіча генеральным консулам Беларусі ў Нью-Ёрку (ЗША).

■ Справа маладых

## СЮДЫ ТРАПЛЯЮЦЬ САМЫЯ ПАДРЫХТАВАНЫЯ

### Моладзь Беларусі, Расіі і Казахстана дапамагае будаваць аб'екты Астравецкай АЭС

**Пяць 11-гадзінных працоўных дзён у тыдзень, скарочаная да 15:00-16:00 змена ў суботу. Па вечарах і ў адзіны вольны дзень — нядзелю — грамадска-спартыўная і культурная праграма. Турніры па футболе, валейболе, баскетболе, сімвалічныя святы, экскурсіі па гістарычных мясцінах Беларусі. І ўсё гэта трэба паспець за два няпоўныя месяцы, пакуль доўжыцца змена ў студэнцкім атрадзе, што працуе на будоўлі аб'ектаў Беларускай атамнай электрастанцыі каля Астраўца.**





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### НА БУДОЎЛЮ — ПА КОНКУРСЕ

Усебеларуская маладзёжная будоўля (УМБ) на АЭС працуе ў Беларусі ўжо трэці год, кожны раз павялічваючы колькасць сваіх удзельнікаў. Летась тут адпрацавала больш за 400 студэнтаў: членаў грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і маладзёжнай грамадскай агульнарасійскай арганізацыі «Расійскія студэнцкія атрады». Сёлета чакаецца, што іх будзе каля 800. Больш як 300 студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта ў 2016-м ужо прайшлі тут працоўную практыку. А ў ліпені на станцыі пачаўся трэці працоўны семестр, які лічыцца ў моладзі самым пачэсным.

У ім удзельнічаюць 428 чалавек з 18 беларускіх і 5 расійскіх атрадаў. Упершыню да студэнцкага руху Саюзнай дзяржавы далучыліся і сем студэнтаў з Казахстана.

СТАР. 2

■ На слыху

## НАРАБІЛА БЯДЫ НЕПАГАДЗЬ

### Вецер, больш падобны на тарнада, калечыў жывёлу і людзей

**Надвор'е, што прыйшло ў Беларусь на пачатку гэтага тыдня, ужо ў панядзелак нанесла нямала шкоды. Як паведамляе прадпрыемства «Белэнерга», толькі 11 ліпеня без святла застаўся 301 населены пункт па ўсёй краіне. Па стане на 9 гадзін раніцы 12 ліпеня без энергазабеспячэння заставаліся 29 населеных пунктаў. Асабліва цяжка прыйшлося паўночна-заходнім рэгіёнам Беларусі: шквалісты вецер і смерч выдзіраў з зямлі дрэвы, пераварочваў машыны і нават разбураў будынкі...**

Эпіцэнтрам стыхіі стала Шаркаўшчына — над райцэнтрам пранёсся сапраўдны тарнада, шматлікія здымкі якога выкладвалі ў інтэрнэт відавочцы. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у 16:30 на запасных пуцях чыгуначнай станцыі ў гарадскім пасёлку былі сарваны два казлавыя краны. Ад інцыдэнту ніхто не пацярпеў, затрымкі ў руху цягнікоў не было. У гэты ж час зусім непадалёк, у вёсцы Маркі Шаркаўшчынскага раёна абваліліся тры цялятнікі 1960 года пабудовы, якія належалі мясцовай малочна-таварнай ферме. Пацярпелыя — 35 гадавалых цялят. На аўтадарозе побач з пасёлкам гарадскога тыпу пераварнуўся грузавы аўтамабіль IVECO.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Новым прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі стане Тэрэза Мэй



Тэрэза Мэй стане новым прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на кіраўніка ўрада краіны Дэвіда Кэмерана. Зараз спадарыня Мэй узначальвае Міністэрства ўнутраных спраў Вялікабрытаніі. Дэвід Кэмеран заявіў пра свой намер сысці ў адстаўку пасля таго, як у Злучаным Каралеўстве прайшоў рэферэндум, на якім большасцю галасоў грамадзяне абралі выхад з Еўрапейскага саюза.

### У Італіі сутыкнуліся пасажырскія цягнікі



На поўдні Італіі ў правінцыі Бары сутыкнуліся два пасажырскія цягнікі. Па звестках La Repubblica, у выніку аварыі загінулі чатыры чалавекі, дзесяць атрымалі траўмы. У той жа час ANSA паведамляе аб 10 ахвярах. Аварыя адбылася на ўчастку паміж гарадамі Рува-ды-Пулья і Карата. Па невядомай прычыне цягнікі апынуліся на адным пуці і сутыкнуліся на поўным ходу. На месца здарэння неўзабаве прыбылі медыкі, паліцыя і пажарныя. Па звестках паліцыі, загінула як мінімум пяць чалавек, а пажарныя паведамляюць пра дзесяць ахвяр. Удар быў вельмі моцным. Першыя вагоны цалкам пагнутыя. Выратавальнікам даводзілася разразаць пашкоджаныя карпусы, каб прабіцца да людзей.

### Разведка Германіі праслухоўвала ўрады краін Еўрасаюза і НАТА

Германскі парламенцкі камітэт па кантролі за дзейнасцю спецслужбаў даў справаздачу аб маштабах сачэння ФРГ за кіраўніцтвам краін Еўрасаюза і НАТА. Паводле звестак ведамства, праслухоўцы падвяргаліся кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў, міністры, а таксама іх асяроддзе. Асабліва інтэнсіўнае назіранне вялося за дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі дзяржаў ЕС і Паўночнаатлантычнага альянсу. Акрамя таго, праслухоўвалі арганізацыі, аб'екты няўрадавых арганізацый і бізнесу. Першапачаткова пасля выкрыццяў эксагента ЦРУ Эдварда Сноўдэна стала вядома пра маштабы сачэння разведкі ЗША, якая шпіёніла за сотнямі тысяч грамадзян ФРГ. Ужо пасля высветлілася, што сачыць за аб'ектамі ў Еўропе амерыканцам дапамагала германская спецслужба.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

#### Знойдзены спосаб пазбегнуць заўчаснай смерці

Даследчыкі з Гарвардскага ўніверсітэта высветлілі, што спажыванне ў вялікіх колькасцях ненасычаных тлушчаў, якія ўтрымліваюцца ў алеях, звязана з нізкай верагоднасцю ранняй смерці. У той жа час рацыён, які змяшчае вялікую колькасць жывёльных тлушчаў, наадварот, спрыяе пагаршэнню здароўя. Артыкул апублікаваны ў JAMA Internal Medicine. Дыетолагі высветлілі, што калі замяніць насычаныя тлушчы, якія ўтрымліваюцца ў сметанковым масле, сале і чырвоным мясе, ненасычанымі з аліўкавага, рапсавага і соевага алеяў, то можна пазбегнуць сур'ёзных праблем са здароўем. Аказалася, што розныя тыпы тлушчаў па-рознаму ўплывалі на стан арганізма. Транстлушчы (утрымліваюцца ў мясных і малочных прадуктах) апынуліся самымі шкоднымі: калі павялічыць іх спажыванне ўсяго на два працэнты, то рызыка заўчаснай смерці павысіцца на 16 працэнтаў. Пяціпрацэнтнае павелічэнне спажывання насычаных тлушчаў звязана з дадатковымі васьмю працэнтамі смерцяў. А вось ненасычаныя тлушчы аказваюць прама супрацьлеглы эфект. Узбагачаная імі дыета зніжала верагоднасць смерці на 11-19 працэнтаў.

### КОРАТКА

**Беларусь мае намер да 2020 года павялічыць даходы ад транзіту да $1,5 млрд, паведаміў міністр транспарту і камунікацый Анатоль Сівак на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.**

Адпаведна ўказу Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Алена Спірыдовіч узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны.

**Памер месячнай мінімальнай заработнай платы (МЗП) за чэрвень бягучага года індэксуецца на 5,4%. Гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэн за чэрвень перасягнуў пяціпрацэнтны парог да месяца яе ўстанаўлення (студзень 2016 года).**

Энергазабеспячэнне, парушанае разгулам стыхіі, было адноўлена ў аўторак да 16.30 ва ўсіх населеных пунктах Беларусі, паведамілі ў «Белэнерга».

**Шэсць беларускіх прадпрыемстваў адзначаны прэміямі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг.**





## ПАЙСЦІ І ВЯРНУЦЦА

### Як не трапіць у спісы зніклых у лясах

**За апошнія два тыдні на тэрыторыі толькі Мінскай вобласці людзі ў лясах губляліся чатыры разы. 27 чэрвеня а сёмай гадзіне вечара ад дзяжурнага па РУУС Пухавіцкага раёна паступіла паведамленне аб тым, што паблізу вёскі Талька ў лясным масіве згубіўся чалавек. Падчас высвятлення абставін стала вядома, што ў лесе заблудзіла 78-гадовая бабуля, якая пастаянна пражывае ў Мінску. На пошук старой рушылі супрацоўнікі РУУС, МНС і пошукава-выратавальны атрад «Анёл». Менавіта яго ўдзельнікі і адшукалі бабулю а чацвёртай гадзіне ночы...**



Яшчэ тры выпадкі блукання ў лесе скончыліся менш драматычна. Паведамленні аб зніклых людзях паступалі ў Вілейскі і Лагойскі раённыя аддзелы па надзвычайных сітуацыях. Што прыкметна, усе званкі адбыліся ў прыцемках — ад 22 да 23 гадзін.

— А ў адным выпадку зніклы ў лесе патэлефанаваў самастойна, — расказвае **прэс-сакратар Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Крысціна БАРЭЙКА.** — Ён пайшоў у нетры а восьмай гадзіне вечара. Сітуацыя ўскладнялася тым, што чалавек заблудзіў у балоцістай мясцовасці. Але наступнай раніцай ён самастойна выйшаў з гушчару. Як, зрэшты, і ўсе іншыя блукальнікі.

СТАР. 6